Упраўленне адукацыі Ваўкавыскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 1 г.п.Рось”

# РОЗДУМ НАД ТВОРЧАСЦЮ МАКСІМА ТАНКА

Аўтар: Васілеўскі Яўгеній Аляксандравіч,
вучань 9 “В” класа
сярэдняй школы №1 г.п. Рось
Кіраўнік: Палішчук Жанна Уладзіміраўна

Рось 2012

За вокнамі цёмна. Стогне вецер. На старым дубе трымціць яшчэ зялёнае лісце. У хаце цёпла і ціха. У пячурцы гарыць агонь.Я пераглядаю старыя газеты, часопісы, якія даўно ўжо трэба спаліць. Мае пальцы дакранаюцца да фотаздымкаў, я бачу твары незнаёмых мне людзей. І раптам трапляю на невялікі верш. Бяру газету ў рукі і ўголас чытаю:

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас друга – на хвіліну спыніць,
Голас любай- сагрэць сонцам лета,
Голас маці – вярнуць з таго свету.

Незвычайныя радкі. Як яны не падобныя на тыя, што мы вучым у школе! Няма ў іх ніводнага тропа. Няма слоў “люблю”,”шаную”. Але ёсць, напэўна, самае галоўнае – сцвярджэнне сілы і ўсемагутнасці голасу маці.

Я яшчэ не ведаю, хто з’яўляецца аўтарам гэтых цудоўных радкоў, але сэрцам адчуваю, што яны дапамагаюць маёй душы вырвацца з душнага палону. У мяне быццам бы растуць крылы… Прызнаюся, у малодшых класах мяне не вельмі цягнула да паэзіі, а вось цяпер не адарваць ад яе, асабліва такой, дзе гаворыцца пра пачуцці. Зноў чытаю радкі. Разумею, што хацеў сказаць аўтар: голас сябра і незнаёмага можа толькі здзівіць, голас каханай – падарыць шчасце. І толькі голас маці можа вярнуць з таго свету, ажывіць.

Пасля гэтага здарэння я зацікавіўся паэзіяй яшчэ больш. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры паведаміла, што радкі, якія я чытаў, належаць пяру Максіма Танка, а верш, што так уразіў мяне, называецца “Голас”. Яна здзіўлена паглядзела на мяне і працягнула невялічкую кнігу вершаў Максіма Танка “Дарога закалыханая жытам”. Мне не трэба было нічога гаварыць. Я моўчкі узяў кнігу, схаваў яе пад кашулю, каб яна не змокла, бо на вуліцы ішоў касы дождж. Пранізлівы вецер зрываў жоўта-чырвонае кляновае лісце і нёс яго па дарозе. Так хацелася хутчэй сесці каля цёплай печцы і з кавай у руцэ пачаць чытаць вершы Максіма Танка.

…І вось я трымаю ў руках зборнік вершаў. Спачатку чытаю адзін верш, потым другі і ўжо не магу спыніцца:

Лес часамі
Загараецца ад перуна,
Любоў- ад мімалётнага позірку,
Сляза – ад болю…
І толькі песня,
Як алімпійская паходня,
Загараецца ад сонца –
Ад сонца ў сэрцы.

На хвілінку задумваюся. Радкі прасякнуты трапяткім цяплом, сардэчнымі парывамі, яны апальваюць маё сэрца, прымушаюць яго біцца гучней. Яны не халодныя, як большасць вершаў, што я чытаў раней, а наадварот грэюць маё сэрца, напаўняюць яго “Праметэевым” агнём перажывання. Ахоплены новымі пачуццямі, я тэлефаную сябру і пычынаю цытаваць гэтыя радкі. Мой сябар не разумее мяне, яму верш не падабаецца. Не, я не пакрыўджаны на яго. Хутчэй за ўсё, ён палічыў прачытаны верш надуманым. Ён чамусьці не адчуў, як нараджаюцца ў радках глыбокія ісціны, высокія ідэі, вера ў тое, што песня паэта можа нарадзіцца толькі ў шчырым, гарачым сэрцы. А дзе ж узяць такое сэрца ў нашым трывожным і імклівым стагоддзі? Мне здаецца, што гэта лёгка зразумець, калі часцей звяртацца да паэзіі Максіма Танка.

Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
- Што самае цяжкае
На гэтым свеце?
І ён адказаў:
- Прайсці праз вернасць.

У кожным слове адчуваецца вернасць свайму народу, сваёй Бацькаўшчыне, роднай маці, каханай, роднай матчынай мове. Ці не выклікае такі чалавек павагі? Безумоўна, выклікае. Я таксама хацеў бы прайсці дарогай вернасці, якой непахісна ішоў Максім Танк, каб не згубіць упэўненасці ў перамозе праўды над крыўдай, каб не забыць, як гучыць родная мова.

Роздум над танкаўскімі творамі працягваю, бо хачу зразумець, што ж так мяне прываблівае ў яго паэтычных шэдэўрах. Можа тое, што яго паэзія – гэта філасофія жыцця, паглыблены разгляд з’яў, падзей, фактаў у свеце вечных праблем жыцця і смерці, узаемаадносінаў чалавека з грамадствам і прыродай. А можа проста яго вершы нельга назваць лёгкадумнымі, таму што вядуць нас, чытачоў, па шырокім полі жыцця, прымушаюць прыпыніцца каля самых цікавых прыкметаў жыцця, задумацца над пытаннямі, якія ўзнікаюць перад кожным сумленным чалавекам.

Усё вельмі складана. Але я ведаю, што люблю Максіма Танка за яго філасафічную лірыку, сагрэтую дабрынёй і даверам да чалавека. Нельга не любіць вершы, якія гучаць, як шчасце і мука, у якіх адчуваецца сваё разуменне жыццёвых каштоўнасцей.

Я пісаў зямлі многа лістоў

Пяром, якім пішуць лірычныя песні,
Гімны розныя, маніфесты;
Пісаў я смыкамі ўсіх скрыпак,
Якія смяюцца і плачуць;
Пісаў спіцамі дрогкіх калёс,
Якарамі і мачтамі караблёў,
Штыком і сапёрнай лапатай;
Пісаў  кубкамі, з якіх п’юць
За здароўе і вечную памяць,-
Але пакуль атрымаў я
Толькі на ліст мой,
Напісаны плугам.
Вось ён.
Парэжце на скібы яго.
Частуйцеся.
Ешце.

Верш  незвычайны і  складаны.  Я ведаю, што па сваім светаадчуванні, светаразуменні, манеры гаварыць і думаць Максім Танк  вясковы, сялянскі паэт. У яго сэрцы аселі запаветы бацькоў берагчы зямлю, мову і паважана адносіцца на хлеба. Можа таму ён смела гаворыць “не давайце таму хлеба, хто не  любіць роднай глебы, не арэ, не засявае, і век мазалёў не знае”.

Калі я перагарнуў апошнюю старонку  зборніка вершаў, зразумеў, што заўсёды ў цэнтры ўвагі паэта  знаходзіцца чалавек. Сэнс  яго паэзіі ў цеснай сувязі людзей і   прыроды. Што можа быць больш значнае, чым ісціны, выражаныя словамі:

Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі, дажджамі…

Гэтыя словы – сапраўдны гімн матчыным рукам, якія ніколе не ведалі адпачынку. Калі я ўпершыню прачытаў верш “Рукі маці”, то стаў прыглядацца да сваёй матулі, часцей браць яе маленькія рукі ў свае далоні і цалаваць іх. Мне захацелася таксама напісаць верш для  яе, але не змог. Не хапіла мне слоў, ці проста лепш, чым сказаў Танк, я не змагу напісаць. І таму я ціха-ціха прачытаў увечары  верш сваёй матулі. Яна на хвілінку спынілася, вочы яе заблішчалі і на вуснах з’явілася ўсмешка… Маці прытуліла маю галаву да сябе і  ласкава сказала: “Дзякую, сынок!”

…Спускаецца на зямлю ноч, стогне вецер, а мне ўтульна і спакойна, бо кожны дзень я маю магчымасць чытаць незвычайна прыгожыя і чулыя вершы Максіма Танка. Перад сном я, як зачараваны, перачытваю радкі з верша "Акамянелыя волаты":

Зусім не
Нейкі там
Скандынаўскі ляднік
Зямлю нашу
Сваімі валунамі засеяў.
Гэта – акамянелыя
Волаты спяць,
Што свой край баранілі.

Я ўспамінаю пра тое, што на нашай зямлі параскідана шмат вялікіх і малых камянёў. Ведаю, што некаторыя з іх лічацца незвычайнымі, надзеленымі добрай ці злой сілай. Такім камяням пакланяліся нашы продкі, а народ ствараў прыгожыя легенды і паданні. Максім Танк называе іх "камяні Глеба, Рагнеды, Адама, Кастуся Багушэвіча". Чаму так? Можна доўга думаць пра гэта, уяўляць падзеі, успамінаць гісторыю. Але мне хочацца толькі чытаць паэтычныя радкі і з нецярпеннем чакаць раніцы, каб зноў і зноў браць у рукі маленькую кніжачку і чытаць, забыўшы на час.

Прачытаўшы першы свой зборнік вершаў паэта, я зацікавіўся яго жыццём, лёсам. А зусім нядаўна пазнаёміўся з завяшчаннем Максіма Танка. Ён прасіў пахаваць яго на тых могілках, дзе пахаваны яго бацькі.Прытым " не ставіць ніякага помніка" , а толькі на стэле, якую ён паставіў у сваёй маці, дапісаць яго імя – калі можна… "І не называць яго імем ні вуліц, ні ўстаноў, і не ставіць помнікаў, не вешаць мемарыяльных дошак.А на пахаванні не несці ордэнаў".

Мяне здзівіў яшчэ адзін факт. У 1954 годзе пісьменнікі Беларусі Міхась Лынькоў, Аркадзь Куляшоў і Максім Танк атрымалі дазвол урада БССР на будаўніцтва прыватных лечышчаў на Нарачы. Пусты пясчаны бераг ператварыўся ў сад. Сосны і таполі, пасаджаныя іх рукамі, дагэтуль упрыгожваюць гэтае месца. На жаль, я не магу паехаць туды, каб дакрануцца сваімі рукамі да дамоў, якія будавалі народныя пісьменнікі. Я прачытаў на адным з сайтаў аб тым, што мясцовыя ўлады не жадаюць захоўваць пабудовы 50-х гадоў, бо яны не надта ўпісваюцца ў сённяшняе мадэрнізаванае аблічча курорта Нарач. Але чаму мы, нашчадкі пісьменнікаў, маўчым і не жадаем спрачацца з чыноўнікамі? Мне так хочацца, каб месца каля возера Нарач ператварылася ў гістарычны помнік, каб кожны з нас узяў

на сябе клопат аб іх захаванні. Можа тады ўзровень культуры сярод моладзі значна вырасце і мы перастанем быць бездухоўным пакаленнем, пакаленнем, якое перастала чытаць, бо ёсць інтэрнэт і зусім няма часу.

Максім Танк сваімі вершамі пакінуў маленькую кропельку надзеі ў маім сэрцы, што родная беларуская мова ніколі не знікне, не забудзецца, як ніколі не знікне любоў да паэзіі . Я буду верыць у гэта. Я хачу, каб і Вы верылі і помнілі светлае імя беларускага песняра.